УДК 378.126

## АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ МАГІСТРАНТАЎ У ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ БЕЛАРУСІ І ГЕРМАНІІ

***В.М. БОСАК, А.А. БОСАК***
*Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, bosak1@tut.by*

**Уводзіны.** Поспех любой краіны ў вырашэнні эканамічных, палітычных і сацыяльных праблем вызначаецца перш-наперш яе дасягненнямі ў адукацыі і навуцы, што звязана з наяўнасцю ў гэтых галінах магутнага інтэлектуальнага патэнцыялу.

У Рэспубліцы Беларусь атрыманне адукацыі, у т.л. вышэйшай, гарантуецца Канстытуцыяй. Так, у арт. 48 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначана: «Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступна для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць адпаведную адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах» [1].

Асноўнымі мэтамі нацыянальнай вышэйшай школы ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца задавальненне патрэб асобы ў інтэлектуальным, культурным і маральным развіцці праз атрыманне вышэйшай адукацыі на аснове непарарыўнага адзінства навучальнага працэсу і навуковых даследаванняў, а таксама задавальненне патрэб дзяржавы і грамадства ў кваліфікаваных спецыялістах [2].

Мэты дзейнасці вышэйшай навучальнай установы дасягаюцца шляхам рэалізацыі наступных асноўных задач:

- падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў;
- арганізацыя і правядзенне навукова-даследчай работы;
- арганізацыя і правядзенне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў;
- арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

Вышэйшая адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь, як і большасці еўрапейскіх краін, мае дзве ступені [3-7]. Аднак у сістэмах вышэйшай адукацыі Беларусі і Еўропы існуе як падабенства, так і значнае адрозненне, у тым ліку і пры падрыхтоўцы на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры).

Мэта даследаванняў – параўнаць падрыхтоўку на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) беларускіх і нямецкіх ВНУ.

У якасці прыкладаў з беларускага боку ўзята самая маладая вышэйшая навучальная ўстанова Рэспублікі Беларусь – УА «Палескі дзяржаўны універсітэт» (г. Пінск, Брэсцкая вобласць); з нямецкага боку – Універсітэт прыкладных навук Анхальт (Anhalt University of Applied Sciences, Bernburg-Köthen-Dessau, Sachsen-Anhalt), з якім ПалесДУ мае дамову аб супрацоўніцтве [8-9].

**Асноўная частка.** Падрыхтоўка ў магістратуры Палескага дзяржаўнага універсітэта ажыццяўляецца паводле Законаў Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», «Аб вышэйшай адукацыі», палажэнняў «Аб вышэйшай навучальнай установе», «Аб другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры)», а таксама «Правілаў прыёму ў магістратуру вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь» [2-4, 10-11].

Згодна з дадзенымі нарматыўнымі дакументамі, другая ступень вышэйшай адукацыі (магістратура) забяспечвае фарміраванне ведаў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы для наступнай падрыхтоўкі ў аспірантуры (ад'юнктуры), для навуковай, педагагічнай і інавацыйнай дзейнасці. Падрыхтоўку ў магістратуры могуць атрымаць асобы, якія маюць адукацыю першай ступені вышэйшай адукацыі.

Тэрмін навучання ў магістратуры Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці 1-25 80 04 «Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай» складае 1 год. У першым семестры тэарэтычнае навучанне займае 18 тыдняў, экзаменацыйная сесія – 1 тыдзень, вакацыі – 2 тыдні (усяго 21 тыдзень) (табліца 1).

У другім семестры тэарэтычная падрыхтоўка займае 14 тыдняў, экзаменацыйная сесія – 2 тыдні, вакацыі – 4 тыдні, падрыхтоўка магістэрскай дысертацыі – 6 тыдняў, абарона магістэрскай дысертацыі – 1 тыдзень (усяго 27 тыдняў).

ПолесГУ

Пад час навучання ў УА «Палескі дзяржаўны універсітэт» магістранты рыхтуюць магістэрскую дысертацыю, якую абараняюць у дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

Самастойная навукова-даследчая работа пад час падрыхтоўкі ў магістратуры ПалесДУ займае 51,5% ад агульнай колькасці вучэбных гадзін. Непасрэдная падрыхтоўка ў магістратуры складае 960 гадзін, з якіх 67,5% належыць дысцыплінам кандыдацкіх экзаменаў і залікаў.

Табліца 1 – План падрыхтоўкі ў магістратуры Палескага дзяржаўнага універсітэта па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай»

| Дысцыпліны | Колькасць вучэбных гадзін па плану | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | у тым ліку | | | | |
| | | аудыторныя | лекцыі | лабараторныя | практычныя | самастойныя |
| 1. Дысцыпліны кандыдацкіх экзаменаў і залікаў | 648 | 316 | 100 | 172 | 44 | 332 |
| Філасофія і метадалогія навукі | 136 | 104 | 60 | | 44 | 32 |
| Замежная мова | 420 | 140 | | 140 | | 280 |
| Асновы інфармацыйных тэхналогій | 92 | 72 | 40 | 32 | | 20 |
| 2. Прафесійныя дысцыпліны | 312 | 164 | 82 | | 82 | 148 |
| Асновы педагогікі і псіхалогіі вышэйшай школы | 52 | 36 | 18 | | 18 | 16 |
| Эканоміка прадпрыемстваў | 152 | 72 | 36 | | 36 | 80 |
| Кіраванне | 108 | 56 | 28 | | 28 | 52 |
| 3. Навукова-даследчая работа* | 1020 | | | | | 1020 |
| Агульная колькасць гадзін | 1980 | 480 | 182 | 172 | 126 | 1500 |
| Колькасць рэфератаў | 2 | | | | | |
| Колькасць экзаменаў | 4 | | | | | |
| Колькасць залікаў | 2 | | | | | |

*штотыднёва, акрамя перыядаў сесій і вакацый, плануецца 24 гадзіны навуковай работы (кантралюемая самастойная работа – падрыхтоўка да абароны магістэрскай дысертацыі; удзел у навуковых канферэнцыях, семінарах і г.д.).

Падрыхтоўка на другой ступені вышэйшай адукацыі ва Універсітэце прыкладных навук Анхальт, як і большасці еўрапейскіх універсітэтаў, ажыццяўляецца згодна з дэкларацыяй «Зона еўрапейскай вышэйшай адукацыі (Балонская дэкларацыя)», а таксама на аснове асабістай нарматыўнай базы [8, 12]. На дадзены момант «Балонскую дэкларацыю» падпісалі 46 еўрапейскіх краін, у тым ліку 9 краін на тэрыторыі былога Савецкага Саюза (Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова, Латвія, Літва, Расія, Украіна, Эстонія).

Ва Універсітэце прыкладных навук Анхальт працягласць падрыхтоўкі ў магістратуры па спецыяльнасці «Аграбізнес і харчаванне» складае 2 гады (4 семестры). Пачатак заняткаў – 1 кастрычніка (зімні семестр). Перадумовамі залічэння ў склад магістрантаў з'яўляюцца: наяўнасць дыплома аб вышэйшай адукацыі ці дыплома бакалаўра па роднаснай спецыяльнасці нямецкай ці замежнай вышэйшай навучальнай установы, а таксама пацверджанне валодання нямецкай і англійскай мовамі (заняткі, у залежнасці ад выкладаемага прадмета, вядуцца на нямецкай ці англійскай мовах).

Колькасць абітурыентаў неабмежавана (як правіла, далейшае навучанне на другой ступені (ступень магістра) працягваюць не меней паловы выпускнікоў першай ступені навучання (ступень бакалаўра).

Пад час навучання магістранты павінны набраць мінімум 120 крэдытаў у складзе 11 абавязковых модулей і 7 модулей па выбару (усяго існуе 13 модулей па выбару) (табліца 2). Кожны магістрант мае права выбраць дадатковую колькасць модулей па выбару і атрымаць больш як 120 крэдытаў.

ПолесГУ

Табліца 2 – План падрыхтоўкі ў магістратуры Універсітэта прыкладных навук Анхальт па спецыяльнасці «Аграбізнес і харчаванне»

| Семестры | 1 | | 2 | | 3 | | 4 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць гадзін / крэдыты | гадзі-ны | крэ-дыты | гадзі-ны | крэ-дыты | гадзі-ны | крэ-дыты | гадзі-ны | крэ-дыты |
| Модулі | | | | | | | | |
| Сельскагаспадарчая вытворчаць і якасць | 60 | 5 | | | | | | |
| Міжнародная эканоміка | 60 | 5 | | | | | | |
| Якасць прадуктаў харчавання і гігіена | 60 | 5 | | | | | | |
| Тэхналогія прадуктаў харчавання і якасць | 60 | 5 | | | | | | |
| Менеджмент | 60 | 5 | | | | | | |
| Модуль 1 на выбар | 60 | 5 | | | | | | |
| Эканоміка ў вытворчасці харчавання | | | 60 | 5 | | | | |
| Маркетыг прадуктаў харчавання | | | 60 | 5 | | | | |
| Эканоміка АПК | | | 60 | 5 | | | | |
| Праект па аграбізнесу | | | 15 | 2 | | 3 | | |
| Модуль 2 на выбар | | | 60 | 5 | | | | |
| Модуль 3 на выбар | | | 60 | 5 | | | | |
| Модуль 4 на выбар | | | 60 | 5 | | | | |
| Распрацоўка ў галіне аграбізнесу | | | | | 60 | 5 | | |
| Менеджмент у галінах якасці і навакольнага асяроддзя | | | | | 60 | 5 | | |
| Модуль 5 на выбар | | | | | 60 | 5 | | |
| Модуль 6 на выбар | | | | | 60 | 5 | | |
| Модуль 7 на выбар | | | | | 60 | 5 | | |
| Магістэрская работа і калоквіум (20 тыдняў) | | | | | | | | 30 |
| Па семестрах | 360 | 30 | 375 | 32 | 300 | 28 | | 30 |
| Усяго | | | | | | | 1035 | 120 |

Модулі на выбар: псіхалогія арганізацыі працы; вытворчая гігіена і вытворчаць прадуктаў харчавання; біятэхналогія ў вытворчасці прадуктаў раслінаводства і жывёлагадоўлі; менеджмент у галіне вытворчых паслуг; харчаванне і здароўе; гігіена ў сельскагаспадарчай вытворчасці; інфармацыйныя і гандлёвыя сістэмы; міжнародны гандаль і фінансы; лагістыка; дакладнае земляробства; вытворчы менеджмент; таксікалогія навакольнага асяроддзя; таваразнаўства і якасць прадуктаў харчавання.

Модуль прадстаўляе сабой комплекс тэарэтычных і практычных заняткаў па адпаведнай дысцыпліне. Наведванне заняткаў – вольнае: магістранты самастойна плануюць сваю падрыхтоўку. Планы падрыхтоўкі распрацоўваюцца непасрэдна прафесарамі Універсітэта прыкладных навук Анхальт. Практыка па спецыяльнасці падчас навучання ў магістратуры не з'яўляецца абавязковай, але вітаецца і служыць важкім падмуркам далейшай прафесійнай дзейнасці.

Пад канец 4 семестра кожны магістрант павінен абараніць магістэрскую работу (магістэрскія тэзісы) на спецыяльным паседжанні. Наяўнасць не меней 120 крэдытаў і абароненай магістэрскай работы з'яўляецца падставай прысуджэння суіскальніку акадэмічнай ступені магістра навук.

Выпускнікі магістратуры самастойна шукаюць месца працы па спецыяльнасці; яны могуць таксама працягваць падрыхтоўку ў дактарантуры (беларускі адпаведнік «аспірантура») (у Германіі адсутнічаюць кандыдацкія экзамены і залікі акрамя экзамена па спецыяльнасці, які здаецца непасрэдна перад абаронай дысертацыйнай работы).

**Заключэнне.** Навучанне ў магістратуры як Палескага дзяржаўнага універсітэта, так і Універсітэта прыкладных навук Анхальт скіравана на падрыхтоўку высокакваліфікаваных

ПолесГУ

спецыялістаў у адпаведнай галіне. У абодвух універсітэтах магістэрская падрыхтоўка завяршаецца абаронай магістэрскай работы.

Разам з тым, падрыхтоўка ў магістратуры Палескага дзяржаўнага універсітэта, як і ў іншых беларускіх ВНУ, скіравана, перш-наперш, на далейшую навуковую дзейнасць і навучанне ў аспірантуры (навукова-педагагічная дзейнасць). Значнае месца пад час навучання ў магістратуры беларускіх ВНУ надаецца вывучэнню цыкла дысцыплін кандыдацкіх экзаменаў і залікаў; колькасць прафесійных дысцыплін абмежавана, практыка адсутнічае.

Ва Універсітэце прыкладных навук Анхальт, як і ў іншых нямецкіх ВНУ, падрыхтоўка ў магістратуры не звязана непасрэдна с далейшым навучаннем у аспірантуры і накіравана ў першую чаргу на навукова-вытворчую дзейнасць (асноўнае месца пад час падрыхтоўкі надаецца вывучэнню спецыяльных дысцыплін (мінімум 18 спецыяльных дысцыплін), падрыхтоўцы і абароне магістэрскай работы – усяго не меней 120 крэдытаў).

## ЛІТАРАТУРА


1. Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп. от 24.11.1996 г. и 17.10.2004 г. – Минск: Нац. Центр правовой информ. РБ, 2007. – 64 с.
2. Положение о высшем учебном заведении (Утверждено постановлением Совета министров Республики Беларусь 18.01.2008 № 68 с изменениями и дополнениями от 16.04.2008 № 565 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2008. – № 95, 5/27523.
3. Закон Республики Беларусь «Об образовании» (принят 29.10.1991 г., в редакции от 11.07.2007 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1991. – № 33.
4. Закон Республики Беларусь «О высшем образовании» (принят 11.07.2007) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2007. – № 17, 2/1349.
5. Ганчеренок, И.И. Шведская модель магистерской подготовки / И.И. Ганчеренок, Е.Л. Грибовская // Вышэйшая школа. – 2001. – № 5. – С. 41–46.
6. Кредитные технологии в высшем образовании / И.И. Ганчеренок [и др.]. – Минск: РИВШ БГУ, 2003. – 132 с.
7. Плаксий, С.И. Болонский процесс / С.И. Плаксий // Знание. Понимание. Умение. – 2005. – № 3. – С. 203-206.
8. http://www.hs-anhalt.de
9. http://www.psunbrb.by
10. Положение о второй ступени высшего образования (магистратуре) (Утверждено постановлением Совета министров Республики Беларусь 18.01.2008 № 68 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2008. – № 30, 5/26697.
11. Правила приема в магистратуру высших учебных заведений Республики Беларусь (Утверждены постановлением Совета министров Республики Беларусь 18.01.2008 № 68 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2008. – № 30, 5/26697.
12. Декларация «Зона европейского высшего образования (Болонская декларация)» (принята 19.06.1999 г. в г. Болонья (Италия)) // http://www.ond.vlaanderen.be/hogeronderwijs/bologna


Полесгу

## THE SPECIALITIES OF UNDERGRADUATE TRAINING IN HIGHER EDUCATION ESTABLISHMENTS IN BELARUS AND GERMANY

*V.M. BOSAK, A.A. BOSAK*

***Summary***

There are some features of training in graduate studies in higher education establishments in Belarus and Germany by the example of Palesky State University and Anhalt University of Applied Sciences.

It was found out that education process in Belarusian institutions of higher education is focused in the first place on training in the field of science and pedagogic while in Germany – in the field of scientific production activity.

© Босак В.М., Босак А.А

*Паступіў у рэдакцыю 14 жніўня 2009 г.*